ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама

А.Л. Вярсоцкі
2018 г.



ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага свята-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення рэгіянальнага свята-кірмашу вырабаў рамеснікаў “Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня” (далей – свята-кірмаш).

2. Арганізатарамі свята-кірмашу з’яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

3. Мэтамі і задачамі свята-кірмашу з’яўляюцца: захаванне і папулярызацыя рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай нематэрыяльнай культуры Гродзенскай вобласці. Далучэнне шырокай грамадскасці да асаблівасцей традыцыйнай культуры рэгёнаў; знаёмства жыхароў і гасцей Гродзеншчыны з мясцовымі традыцыямі святкавання Вялікадня; папулярызацыя розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і традыцыйных рамёстваў, а таксама творчасці народных майстроў і носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; далучэнне да традыцыйнай культуры дзяцей і падлеткаў, а таксама ўсіх жадаючых праз навучанне і майстар-класы ад носьбітаў традыцыйнай культуры Гродзеншчыны.

4. Свята-кірмаш праводзіцца штогод на пярэдадні свята Вялікадня па каталіцкім ці праваслаўным календары ў г. Гродна.

5. У свяце-кірмашы прымаюць удзел майстры народнай творчасці раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, аддзелаў традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры, рамеснікі, носьбіты элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны.

6. Заяўкі на ўдзел у свяце-кірмашы дасылаюцца на электронны адрас ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (onmcnt@tut.by) з адзнакай “Вялікдзень” за два тыдні да мерапрыемства (тэл/факс: 8(0152)72 27 04).

7. Праграма свята-кірмашу ўключае: урачыстае адкрыццё свята, знаёмства з рэгіянальнымі асаблівасцямі святкавання Вялікадня на Гродзеншчыне; майстар-класы ад народных майстроў, рамеснікаў і носьбітаў элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны; выстаўку-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці аддзелаў традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры, раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў; падвядзенне вынікаў свята-кірмашу і заахвочванне лепшых удзельнікаў; урачыстае закрыццё свята.

8. У рамках свята-кірмашу арганізавана праца тэматычных пляцовак:

- “лепшых калекцый велікодных яек”;

- “лепшых калекцый велікодных паштовак” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш 5 вырабаў);

- “лепшых велікодных кошыкаў” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш 3 вырабаў);

- “лепшых дэкаратыўных пано, прысвечаных велікоднай тэматыцы”;

- “лепшых калекцый велікодных вербаў” (кожны ўдзельнік прадстаўляе не менш 5 вырабаў);

- “лепшая калекцыя традыцыйнага печыва”.

9. Работы, прадстаўленныя на сцэнічных пляцоўках, абавязкова павінны адпавядаць велікоднай тэматыцы, традыцыям пэўнага віду народнай культуры і рамёстваў.

10. Па выніках работы сцэнічных пляцовак удзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

11. Фінансаванне свята-кірмашу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: заработная плата майстрам за правядзенне майстар-класаў; паслугі па музычнаму афармленню і гукаўзмацненню; арэнда сцэнічнай пляцоўкі, паслугі па афармленню сцэнічнай і выставачных пляцовак кампазіцыямі з прыродных матэрыялаў; выраб афіш; пракат шатроў; набыццё дыпломаў; набыццё расходнага матэрыялу для афармлення сцэнічнай і выставачных пляцовак (тканіна).

12. Для фінансавання свята-кірмашу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага свята-кірмашу вырабаў рамеснікаў "Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
____________райгарвыканкама

ЗАЯЎКА
на ўдзел у рэгіянальным свяце-кірмашы "Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня"

1. Намінацыя (альбо некалькі намінацый), колькасць работ (у кожнай з намінацый)________________________________________
________________________________________
________________________________________
2. Раён, установа, якую прадстаўляе канкурсант________________________
________________________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку ________________________________
________________________________________
4. Пашпартныя дадзеныя ________________________________
________________________________________
________________________________________
________________________________________
5. Кантактны тэлефон________________________________

Кіраўнік базавай установы

______________________ ________________

*(ініцыялы прозвішча)* *(подпіс)*

Заяўкі на ўдзел дасылаюцца на электроны адрас ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" (onmcnt@tut.by) з адзнакай "Вялікдзень" да 19 сакавіка (тэл/факс: 8(0152)72 27 04).

Пятрук 74 04 48